**І. Г. Бачыла**

УДК 39 (= 161.3)

Кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, гістарычны факультэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ

# АЙЧЫННЫЯ ЖАНЧЫНЫ-ЭТНОЛАГІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX – ПАЧ. XXI СТСТ. АБ ТРАДЫЦЫЙНАЙ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

Артыкул прысвечаны ўкладу жанчын-вучоных другой паловы XX – пачатку XXI стст. у этналагічнае вывучэнне традыцыйнай матэрыяльнай культуры беларусаў.

**Ключавыя словы:** жанчыны-вучоныя, этналогія, даследаванне, матэрыяльная культура.

**Узор цытавання:** *Бачыла І. Г.* Айчынныя жанчыны-этнолагі другой паловы XX – пач. XXI стст. аб традыцыйнай матэрыяльнай культуры беларусаў // София: электрон. науч.-просветит. журн. 2019. № 2. С. 3–7.

**I. Bochilo**

Department of ethnology, museology and history of arts, faculty of history, Belarusian State University, Minsk, Belarus

# NATIONAL WOMEN-ETHNOLOGISTS OF THE SECOND HALF OF XX – THE BEGINNING OF XXI CENTURIES ABOUT TRADITIONAL MATERIAL CULTURE OF BELARUSIANS

The article is devoted to the contribution of women-scientists of the second half of XX – the beginning of XXI centuries to the study of traditional material culture of Belarusians.



**Keywords:** women-scientists, ethnology, research, material culture.

**For citation:** Bochilo, I. (2019). National women-ethnologists of the second half of XX – the beginning of XXI centuries about traditional material culture of Belarusians. *Sophia*, 2, 3–7 (in Belar.).

**Аўтар:**

**Ірына Генадзеўна Бачыла** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ.
*bochilka@yandex.by*

**Author:**

**Irina Bochilo** – PhD in history, associate professor of the department of ethnology, museology and history of arts of the faculty of history, BSU.

У другой палове XX ст. традыцыйная матэрыяльная культура беларусаў робіцца адным з прыярытэтных накірункаў этналагічных даследаванняў. Больш чым за паўстагоддзя айчыннымі навукоўцамі былі сабраны матэрыялы аб разнастайных баках гэтай часткі культуры, зафіксаваны, ахарактарызаваны і перададзены ў музеі Беларусі шматлікія яе ўзоры, якія знаходзіліся пад пагрозай знікнення, з’явіліся першыя спецыяльныя даследаванні па праблеме, склаліся розныя падыходы да яе вывучэння,

былі сфармуляваны арыгінальныя канцэпцыі. У гэтым істотная заслуга жанчын-этнолагаў. Вынікі іх навуковых дасягненняў у дадзенай галіне ўражваюць і вартыя асаблівай увагі.

Ключавая роля ў наладжванні мэтанакіраванага і сістэмнага вывучэння матэрыяльнай культуры беларусаў належыць доктару гістарычных навук Лідзіі Аляксандраўне Малчанавай. Яе імя шырока вядома ў гуманітарнай навуцы. Паспяхова абараніўшы ў 1948 г. кандыдацкую дысертацыю ў Ленінградзе, даследчыца была запрошана на працу ў Акадэмію навук БССР. З таго часу за ёй замацаваўся прыярытэт у вывучэнні адной з найбольш шырокіх галін этналагічнай навукі – матэрыяльнай культуры. Лідзіяй Аляксандраўнай напісаны і апублікаваны шматлікія работы амаль па ўсіх аспектах гэтай часткі культуры: паселішчах і сядзібах, традыцыях харчавання і прадметах начыння, касцюму, сельскагаспадарчых прыладах працы. Значны ўклад даследчыца ўнесла ў вывучэнне гістарычна-этнаграфічнага раяніравання матэрыяльнай культуры беларусаў. Манаграфіі Л. А. Малчанавай «Материальная культура белорусов» (1968), «Очерки материальной культуры белорусов XVI–XVIII вв.» (1981) сталі вынікам яе шматгадовых даследаванняў, падрыхтаваны на падставе ўнушальнай базы крыніц і глыбокай аўтарскай аналітычнай працы.

Важнае значэнне Лідзія Аляксандраўна надавала збору палявых этнаграфічных матэрыялаў. Вопыт яе экспедыцыйнай працы налічвае не адно дзесяцігоддзе. За гэты час была абследавана ўся тэрыторыя Беларусі, а сабраныя дадзеныя паслужылі найважнейшай першакрыніцай для распрацоўкі пытанняў, якія раней спецыяльна ў айчыннай этналогіі не даследаваліся. Л. А. Малчанава дасканала валодала метадамі палявой працы, перадавала ўласны досвед маладым навукоўцам. Сярод іх была і Ганна Мікалаеўна Курыловіч.

У этналагічную навуку Г. М. Курыловіч прыйшла ў другой палове 1960-х гг. Каштоўным вопытам для яе як для пачынаючага даследчыка стаў удзел у стварэнні рэгіянальнага гістарычна-этнаграфічнага атласа Беларусі. Гэта была частка глабальнага навуковага праекту па стварэнню спецыяльных прац, якія ахопліваюць усе вобласці традыцыйнай культуры народаў СССР. У ходзе даследавання Ганна Мікалаеўна займалася вывучэннем развіцця і лакальных асаблівасцей сялянскага касцюма. Сабраныя ёй матэрыялы былі пакладзены ў аснову асобнага раздзела калектыўнай працы «Беларускае народнае адзенне» (1975), а таксама паслужылі сур'ёзнай базай для распрацоўкі малавывучанага ў айчыннай этналогіі пытання – традыцый ткацтва. Па дадзенай праблеме Ганнай Мікалаеўнай у 1979 г. была паспяхова абаронена кандыдацкая дысертацыя, а ў 1981 г. апублікавана манаграфія «Белорусское народное ткачество». Праца стала першым спецыяльным выданнем, у якім паказана развіццё беларускага ткацтва з сярэдзіны XIX ст. да 1980-х гг., выяўлены агульныя рысы ў ткацтве беларусаў і іншых славянскіх этнасаў, падрабязна разгледжаны сыравіна і спосабы яе апрацоўкі, тэхнікі вырабу тканін, іх арнаментальнае і колеравае аздабленне, выкарыстанне і арэалы распаўсюджання ткацкіх прылад працы.

Высокі інтарэс да вывучэння традыцыйных промыслаў і рамёстваў беларусаў дэманстравалі многія калегі Г. М. Курыловіч. Сярод такіх – Ніна Іванаўна Буракоўская. Пасля вучобы ў Маскоўскім дзяржаўным гісторыка-архіўным інстытуце яна працавала ў вядучых архівах Беларусі. Імкнучыся паглыбіць уласную кваліфікацыю, паступіла ў аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, дзе стала паглыблена даследаваць промыслы і рамёствы беларусаў канца XVIII–XIX стст.

Ніна Іванаўна збірала матэрыялы па цэламу раду пытанняў: пляценне і мачальны промысел, апрацоўка скуры, футра, воўны, лесахімічныя промыслы, транспартныя сродкі. З гэтай мэтай актыўна працавала ў архівах, рэгулярна выязджала ў экспедыцыі. Падчас працы «ў полі», па сведчанні калег, была асабліва заўзятай і напорыстай. Вынікам праведзеных даследаванняў стала паспяховая абарона кандыдацкай дысертацыі «Промыслы и ремёсла белорусов в период разложения феодализма и утверждения капитализма (конец XVIII–XIX вв.)» (1982), а таксама значная колькасць публікацый аўтара [2–4]. У іх даследчыца паказала месца прамысловых і рамесных заняткаў у структуры матэрыяльнай культуры беларускага этнасу, класіфікавала віды промыслаў і рамеснай тэхнікі, ахарактарызавала шэраг тэхналагічных прыёмаў, выявіла арэалы геаграфічнага распаўсюджання асобных відаў заняткаў (лесахімічных, рагожнага і шапавальнага промыслаў, вытворчасці запалак, суднабудаўніцтва), іх агульныя рысы і лакальныя асаблівасці.

У рамках агульных рысаў нацыянальнай культуры рэгіянальныя адрозненні вызначаліся не толькі ў прамысловых і рамесных занятках, але і ў іншых аспектах матэрыяльнай культуры беларусаў. Так, у працах Алы Мікалаеўны Нароўскай асвятляецца пытанне агульных і лакальных асаблівасцей інтэр'еру жылля беларусаў у канцы XIX – пачатку XX стст. [7; 8]. Даследчыца паказала, што канкрэтных меж паміж гістарычна-этнаграфічнымі рэгіёнамі Беларусі па комплексу прадметаў інтэр'еру правесці немагчыма. Таму ёй быў вылучаны шэраг арэалаў у адпаведнасці з распаўсюджанасцю розных тыпаў печы, размяшчэннем абразоў, іх мацаваннем і аздабленнем ручніком, выкарыстаннем пэўных спосабаў мацавання палацей і калысак. А. М. Нароўская паказала, як ускладненне ўнутранай планіроўкі жылля ўплывала на размяшчэнне і характар некаторых элементаў інтэр'еру, падрабязна ахарактарызавала прылады асвятлення, параўнала выкарыстанне светача беларусамі, рускімі і ўкраінцамі. Актуальныя публікацыі Алы Мікалаеўны прысвечаны семіётыцы структуры традыцыйнага жылля беларусаў, яго ролі і выкарыстанню ў звычаях і абрадах.

Ва ўмовах некаторага памяншэння цікавасці да праблем матэрыяльнай культуры з боку айчыннай этналогіі ў 1990-х гг., акадэмічныя даследчыцы не толькі зберaглі лепшыя навуковыя дасягненні ў гэтай галіне, але і працягнулі грунтоўнае вывучэнне тых пытанняў, якія да таго былі маладаследаванымі. Нарэшце былі падрыхтаваны комплексныя выданні, з'яўлення якіх гуманітарная навука чакала не адно дзесяцігоддзе.

Манаграфіі «Жаночы касцюм на Беларусі» (2007) і «Мужчынскі касцюм на Беларусі» (2007) – першыя даследаванні такога роду ў айчыннай этналогіі. Яны дэманструюць багацце беларускага касцюма, яго этнічную спецыфіку, разнастайнасць, сувязь з еўрапейскімі традыцыямі. Іх з'яўленне стала магчымым дзякуючы крапатлівай працы вядомых беларускіх этнолагаў – Валянціны Мікалаеўны Бялявінай і Любові Васільеўны Ракавай. Кола крыніц, апрацаваных у ходзе даследавання, уражвае: пісьмовыя крыніцы XV–XVIII стст., этнаграфічная і этналінгвістычная літаратура XIX–XX стст., археалагічныя дадзеныя, музейныя калекцыі. Значную частку выкарыстаных дадзеных склалі матэрыялы этнаграфічных экспедыцый сектара этнаграфіі 1950–1970-х гг., асабістых збораў Л. В. Ракавай і В. М. Бялявінай 1990–2006 гг. Частка крыніц была здабыта даследчыцамі ў замежных архівах, доступ да якіх доўгі час быў абмежаваны. У 2017 г. названыя манаграфіі былі апублікаваны пад адной вокладкай – «Беларускі касцюм» [1].

На рахунку даследчыц маюцца самастойныя аўтарскія публікацыі, прысвечаныя асобным аспектам матэрыяльнай культуры беларусаў. Так, на падставе

працы са старажытнымі пісьмовымі актавымі дакументамі, хронікамі XVI–XVIII стст., архіўнымі матэрыяламі XIX–XX стст. і дадзенымі палявых этнаграфічных даследаванняў Л. В. Ракава падрыхтавала манаграфію аб традыцыях агародніцтва [9]. У працы ўпершыню ў беларускай этналогіі разглядаецца агародніцтва як адзін са старажытных заняткаў беларусаў: паказаны асаблівасці апрацоўкі глебы, прылады працы, тэхналогіі вырошчвання і распаўсюджвання агародных культур у розныя эпохі і ў розных сацыяльных групах. Асобны раздзел манаграфіі прысвечаны аналізу разнастайных вераванняў, звычаяў і рытуалаў беларусаў, звязаных з агародніцтвам.

Значна ўзбагаціла айчынную этналогію манаграфія Валянціны Мікалаеўны Бялявінай «Хлеб надзённы беларускай вёскі» (2016). Кніга з’яўляецца першым спецыяльным этналагічным даследаваннем, прысвечаным традыцыям земляробства. Вывучэннем праблемы Валянціна Мікалаеўна пачала займацца яшчэ ў 1960-я гг., калі ўладкавалася на працу ў ІМЭФ АН БССР і разам з калектывам этнографаў стала ўдзельнічаць у экспедыцыях. Важную ролю ў назапашванні адпаведных матэрыялаў адыграў актыўны ўдзел В. М. Бялявінай у шматлікіх навукова-даследчых праектах, што ладзіліся супрацоўнікамі Акадэміі навук, – падрыхтоўка рэгіянальнага гістарычна-этнаграфічнага атласа, вывучэнне новых з’яў у культуры насельніцтва Беларусі ў 1920–1970-я гг., стварэнне Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту і інш. Даследчыца апрацавала багатае кола крыніц: этнаграфічныя матэрыялы, перыядычныя сельскагаспадарчыя выданні XIX – пачатку XX стст., палявыя матэрыялы, дадзеныя дзяржаўнага статыстычнага ўліку, музейныя аб’екты. У працы раскрыты этапы развіцця земляробства ад старажытнасці да пачатку XXI стст. Аўтар паказала развіццё на Беларусі асноўных сістэм земляробства, падрабязна ахарактарызавала іх структуру. У манаграфіі разглядаецца эвалюцыя спосабаў апрацоўкі глебы, прааналізаваны ўплыў клімату на структуру вырошчваемых на Беларусі культур, раскрыты асаблівасці іх высеву з улікам рэгіянальных умоў, сферы выкарыстання. Істотная ўвага была звернута на працэсы ўборкі, апрацоўкі і захавання ўраджаю. Даследчыцай поўна ахарактарызаваны спосабы і матэрыялы для вырабу розных прылад працы для апраўцокі глебы, збору ўраджаю, веяння, малацьбы, паказана тэхналогія іх выкарыстання, абрады і звычаі, якімі суправаджалася праца селяніна.

Доўгі час у беларускай этналогіі відавочнай была неабходнасць у падрыхтоўцы грунтоўнага комплекснага выдання, якое б раскрывала традыцыі беларусаў у галіне жывёлагадоўлі. Прыклад плённага падыходу да вывучэння гэтага пытання прадстаўляюць шматлікія публікацыі Галіны Іванаўны Касяровіч [5; 6], у прыватнасці манаграфія «Традыцыі жывёлагадоўлі Беларусі» (2019). На падставе аналізу багатага кола крыніц (архіўныя, статыстычныя, літаратурныя, палявыя этнаграфічныя матэрыялы) ў кнізе прасочана эвалюцыя жывёлагадоўлі на Беларусі ад старажытных часоў да сучаснасці, ахарактарызаваны традыцыі па ўтрыманні і доглядзе жывёл, нарыхтоўцы і захаванні кармоў, асобная ўвага звернута на светапоглядныя ўяўленні беларусаў аб свойскай жывёле, разглядаюцца народныя веды, звычаі і абрады, звязаныя з дадзенай галіной сельскай гаспадаркі.

Такім чынам, больш за паўстагоддзя жанчыны-вучоныя ажыццяўляюць паспяховыя даследаванні практычна па ўсіх аспектах традыцыйнай матэрыяльнай культуры беларусаў. Іх працы значна ўзбагачаюць айчынную этналагічную навуку, дэманструюць высокі прафесіяналізм аўтараў, адкрываюць шляхі для далейшага вывучэння самых разнастайных і актуальных праблем маладымі навукоўцамі.

## Літаратура

1. Беларускі касцюм / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. – Мінск: Беларусь, 2017. – 461 с.

2. *Бураковская, Н. И.* Отхожие промыслы крестьян-белорусов в период разложения феодализма и начала развития капитализма / Н. И. Бураковская // Известия АН БССР. Серия общественных наук. – 1975. – № 4. – С. 110–120.

3. *Бураковская, Н. И.* Речное судостроение / Н. И. Бураковская // Памятники истории и культуры Белоруссии. – 1979. – № 3. – С. 21–23.

4. *Бураковская, Н. И.* Технология и географическое распространение лесных и деревообрабатывающих промыслов белорусов конца XVIII – 70-х гг. XIX в. / Н. И. Бураковская // Этнографический сборник. – Минск, 1975. – С. 81–82.

5. *Касперович, Г. И.* Традиции животноводства белорусов / Г. И. Касперович // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы»; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2009. – Вып. 7. – С. 265–269.

6. *Каспяровіч, Г. І.* Жывёлагадоўля / Г. І. Каспяровіч // Нарысы гісторыі культуры Беларусі: у 4 т. / А. І. Лакотка [і інш.]; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2015. – Т. 3. Культура сяла XIV – пачатку XX ст. Кн. 1. Матэрыяльная культура. – С. 456–491.

7. *Наровская, А. Н.* Общие и локальные особенности интерьера белорусского народного жилища (конец XIX – начало XX вв.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.07 / А. Н. Наровская; АН БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск, 1989. – 21 с.

8. *Нароўская, А. М.* Змены ва ўнутранай планіроўцы сялянскага жылля (XIX – пачатак XX ст.) / А. М. Нароўская // Быт і культура беларусаў: тэзісы дакладаў навук. канф. «Быт і культура беларусаў», Мінск, красавік 1984 г. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэдкал.: В. К. Бандарчык, А. С. Фядосік. – Мінск, 1984. – С. 29–31.

9. *Ракава, Л. В.* Гісторыя на градках: агародніцтва на Беларусі / Л. В. Ракава. – Мінск: Беларусь, 2008. – 144 с.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 05.07.2019.*